***В.В. Цішчанка***
ІГ НАН Беларусі

# ВЯЛІКІ КНЯЗЬ КАЗІМІР ЯГАЙЛАВІЧ ЯК ВЯРХОЎНЫ РАЗМЕРКАВАЛЬНІК МАТЭРЫЯЛЬНА-ФІНАНСАВЫХ РЭСУРСАЎ ВКЛ (1440—1492 гг.)

На чале ВКЛ знаходзіўся вялікі князь. Адным з галоўных абавязкаў манарха з'яўлялася гаспадарча-фінансавая дзейнасць. Як вярхоўны ўладар ВКЛ Казімір Ягайлавіч у якасці апошняй інстанцыі ажыццяўляў размеркаванне наяўных маёмасна-фінансавых рэсурсаў у краіне. У княстве з уладаннем зямлі было звязана нясенне ваеннай службы. Таму ў першую чаргу праз ажыццяўленне пажалаванняў нерухомай маёмасці вялікі князь рэгуляваў колькасць узброеных сіл дзяржавы. Але ў эканамічнай сферы манарх дзейнічаў не аднаасобна, а ў паразуменні з буйнейшымі панамі і князямі, якія ўваходзілі ў склад гаспадарскай Рады, якая фарміравалася ў той час.

Сярод разнастайных па зместу актаў, якія выдаваў вялікі князь, асноўную масу складалі жалаваныя дадзеныя граматы на зямлю. Зямельныя ўладанні даваліся вярхоўным землеўладальнікам на ўмовах выканання пэўнай службы, тым самым прыдаючы нават вотчынным пажалаванням умоўны характар. Гаспадар раздаваў маёмасць як ва ўмоўнае, так і ў спадчыннае ўладанне.

Пры Казіміры Ягайлавічу пажалаванні ў часовае карыстанне складалі вельмі значную частку. Тым не менш дастаткова распаўсюджанымі былі і прывілеі на вотчыннае ўладанне зямлёй. Князь мог пажалаваць нерухомую маёмасць як населеную людзьмі, так і пустую. Даволі часта прадметам пажалавання з'яўляліся толькі адны людзі, без указання зямлі, на якой яны жылі, але, напэўна, апошняя мелася на ўвазе.

Шматлікія раздачы зямлі вялікім князем, асабліва з правам перадачы яе ў спадчыну, у значнай ступені хутка скарачалі дзяржаўны зямельны фонд, бо зямля толькі ў рэдкіх выпадках вярталася назад у асабістае распараджэнне манарха. Неабходна таксама дадаць, што яшчэ адбывалася (і часта — незаконна) пераўтварэнне часовых трыманняў у вотчыны. Казімір у сілу даўнасці тэрміну трымання прызнаў уладанні, якія былі нададзеныя Вітаўтам, Свідрыгайлам і Жыгімонтам Кейстутавічам.

У тагачасных абставінах не вельмі змянялі сітуацыю пераход на карысць вялікага князя вымарачнай маёмасці і канфіскацыі. Манарх валодаў правам на маёмасць, якая засталася без спадкаемцаў і называлася вымарачнай, "пустовщинами", ці "спадками". Але зем-

лі, якія вызваліліся, звычайна доўга не затрымліваліся ў гаспадара і хутка раздаваліся розным асобам. На практыцы канфіскацыі ў буйных памерах прымяняліся нашмат радзей, чым гэта дапускаў закон, і выкарыстоўваліся часцей за ўсё як часовае пакаранне са зваротам у якасці памілавання, паступова гублялі характар манаршай апалы. Зямельныя ўладанні адымаліся ў першую чаргу за здзейсненыя злачынствы, а маглі і без бачных на гэта прычын, не заўсёды з раўназначнай заменай, а часам — і без яе. Канфіскацыі таксама падлягала без гаспадарскага дазволу захопленая зямля.

Акрамя пажалавання зямлі і людзей, вялікі князь надаваў права палявання і рыбалоўства, рабіў пажалаванні ў грашовай форме і ў натуральным выглядзе (солі, мёду, воску, сукнаў, коней, жыта, аўса, шуб і іншых рэчаў), дазваляў збіраць даходы з пэўных тэрыторый і г.д. Выключна манарху належалі распараджэнне і кантроль за гандлем спіртнымі напіткамі (корчмамі), мытамі, кірмашамі. У якасці пажалаванняў гаспадар выкарыстоўваў розныя ільготы, вызваляючы за кошт дзяржаўнага скарбу пэўных асоб ад падаткаў, павіннасцяў і пошлін.

Такім чынам, вялікі князь Казімір Ягайлавіч заставаўся фактычным вярхоўным землеўладальнікам і размеркавальнікам усіх зямельна-матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў краіны, хоць і разам з Радай, пры яе непасрэдным удзеле ці пад яе кантролем. Ён раздаваў рухомую і нерухомую маёмасць, розныя прыбытковыя артыкулы, грошы і ільготы. Тым не менш па шэрагу вышэйразгледжаных прычын адбывалася паступовае скарачэнне вялікакняжацкага зямельнага фонду, уладар губляў непасрэдны кантроль над значнай часткай дзяржаўных уладанняў. У 1447 г. быў адменены пастаянны грашовы падатак, што ставіла вялікага князя ў фінансавую залежнасць ад магнацтва.

***Л.В. Фокеева***
БГУ (Минск)

## ТЕНДЕНЦИИ ДИНАМИКИ НАСЕЛЕНИЯ РАЙОНОВ ПОЛЬСКО-ПРИБАЛТИЙСКОГО ПРИГРАНИЧЬЯ БЕЛАРУСИ

Приграничные районы являются проблемными территориями с точки зрения экономического, социального и демографического развития. В связи с этим они становятся объектом исследований различных наук, в том числе и географии населения.

Динамика численности населения складывается из совокупности естественного и механического движения. Именно эти две со-